ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
29 чэрвеня 2015 г. № 659-ПСР5

**Аб Падзяцы Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

Изменения и дополнения:

Постановление Президиума Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь от 17 июля 2023 г. № 566-ПСР7

Прэзідыум Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Зацвердзіць:

Палажэнне аб аб'яўленні Падзякі Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (прыкладаецца);

узор спецыяльнага ліста аб аб'яўленні Падзякі Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (прыкладаецца)*.

______________________________

*Не рассылаецца.

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь** **М.Мяснiковiч**

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
29.06.2015 № 659-ПСР5

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб аб'яўленні Падзякі Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

1. Гэта Палажэнне вызначае парадак і ўмовы аб'яўлення Падзякі Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (далей – Падзяка).

2. Падзяка можа быць аб'яўлена членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (далей – Савет Рэспублікі), работнікам Сакратарыята Савета Рэспублікі, іншым грамадзянам

Рэспублікі Беларусь і грамадзянам замежных дзяржаў (далей, калі не вызначана іншае, – грамадзяне), калектывам арганізацый.

3. Падзяка аб'яўляецца за:

вялікі асабісты ўклад у рэалізацыю рашэнняў Савета Рэспублікі, Прэзідыума Савета Рэспублікі, даручэнняў Старшыні Савета Рэспублікі;

актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў Савета Рэспублікі і яго органаў;

шматгадовую добрасумленную работу, паспяховае, узорнае выкананне службовых абавязкаў;

аператыўнае і якаснае выкананне заданняў асобай важнасці і складанасці;

іншыя значныя заслугі.

4. Падзяка аб'яўляецца:

па ініцыятыве Старшыні Савета Рэспублікі;

па прадстаўленні:

намесніка Старшыні Савета Рэспублікі, старшынь пастаянных камісій Савета Рэспублікі;

Начальніка Сакратарыята Савета Рэспублікі (у дачыненні да работнікаў Сакратарыята Савета Рэспублікі).

Прадстаўленне, названае ў частцы першай гэтага пункта, уносіцца з улікам звестак аб грамадзянах Рэспублікі Беларусь, атрыманых з адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях у парадку, прадугледжаным заканадаўствам, а таксама звестак аб учыненых грамадзянамі Рэспублікі Беларусь дзеяннях, якія ствараюць пагрозу нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь.

5. Арганізацыі Рэспублікі Беларусь могуць звяртацца да службовых асоб, названых у абзацах другім і чацвёртым часткі першай пункта 4 гэтага Палажэння, з хадайніцтвам аб аб'яўленні Падзякі сваім работнікам і калектывам.

6. Прадстаўленне, названае ў пункце 4 гэтага Палажэння, афармляецца:

для аб'яўлення Падзякі грамадзянам – згодна з дадаткам 1;

для аб'яўлення Падзякі калектывам арганізацый – згодна з дадаткам 2.

7. Грамадзяне замежных дзяржаў, акрамя тых, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, прадстаўляюцца да аб'яўлення Падзякі па пісьмовым узгадненні з Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

8. Прадстаўленне ўносіцца Старшыні Савета Рэспублікі. Да яго прыкладаецца:

даведка-аб'ектыўка (для грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, а таксама для грамадзяніна замежнай дзяржавы, які пастаянна пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь);

даведка аб асноўных паказчыках работы арганізацыі за апошні год (для калектываў арганізацый);

звесткі з адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях аб здзейсненых грамадзянінам Рэспублікі Беларусь правапарушэннях ці аб іх адсутнасці, а таксама звесткі аб учыненых грамадзянінам Рэспублікі Беларусь дзеяннях, якія ствараюць пагрозу нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, ці аб іх адсутнасці (для грамадзяніна Рэспублікі Беларусь).

9. Рашэнне аб аб’яўленні Падзякі афармляецца распараджэннем Старшыні Савета Рэспублікі. Грамадзяніну, калектыву арганізацыі, якім аб’яўлена Падзяка, уручаецца змешчаны ў рамку спецыяльны ліст аб аб’яўленні Падзякі.

10. Падрыхтоўка праекта распараджэння Старшыні Савета Рэспублікі, а таксама афармленне спецыяльнага ліста аб аб’яўленні Падзякі ажыццяўляюцца структурным падраздзяленнем Сакратарыята Савета Рэспублікі першага ўзроўню кіравання, якое вызначае Начальнік Сакратарыята Савета Рэспублікі.

11. Спецыяльны ліст аб аб’яўленні Падзякі ўручаецца Старшынёй Савета Рэспублікі або ўпаўнаважанай ім асобай ва ўрачыстай абстаноўцы.

12. Грамадзянам, якім аб’яўлена Падзяка, можа выплачвацца грашовае ўзнагароджанне ў памеры да 5 базавых велічынь за кошт сродкаў арганізацый, у якіх яны працуюць.

13. Улік грамадзян, калектываў арганізацый, якім аб’яўлена Падзяка, ажыццяўляецца Сакратарыятам Савета Рэспублікі.

Дадатак 1
да Палажэння
аб аб'яўленні Падзякі
Старшыні Савета Рэспублікі
Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь

**ПРАДСТАЎЛЕННЕ**

1. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку ______________________________
2. Ці з'яўляецца членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ____________________________________________
3. Пасада, месца працы (службы), тэлефон ____________________________
______________________________________________________________
4. Чысло, месяц, год нараджэння ___________________________________
5. Грамадзянства __________________________________________________
6. Месца жыхарства, тэлефон _______________________________________
7. Ці аб'яўлялася раней Падзяка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і дата аб'яўлення ___________
______________________________________________________________
8. Заслугі, за якія прадстаўляецца да аб'яўлення Падзякі Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь _________
______________________________________________________________
______________________________________________________________

Службовая асоба Савета
Рэспублікі Нацыянальнага
сходу
Рэспублікі Беларусь,
Начальнік Сакратарыята
Савета Рэспублікі
Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь _______________ ______________________
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

«__» ______________ 20__ г.

Дадатак 2
да Палажэння
аб аб'яўленні Падзякі
Старшыні Савета Рэспублікі
Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь

**ПРАДСТАЎЛЕННЕ**

1. Назва арганізацыі ________________________________________________
2. Ці аб'яўлялася раней Падзяка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і дата аб'яўлення ___________
_________________________________________________________________________
3. Месца знаходжання, тэлефон ____________________________________
4. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку кіраўніка ___________________
5. Заслугі, за якія прадстаўляецца да аб'яўлення Падзякі Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь __________
_________________________________________________________________________
_________________________________________________________________________

Службовая асоба Савета
Рэспублікі Нацыянальнага
сходу Рэспублікі Беларусь ______________ ______________________
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)
«__» ______________ 20__ г.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова Прэзідыума
Савета Рэспублікі
Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь
29.06.2015 № 659-ПСР5

**Узор спецыяльнага ліста аб аб’яўленні Падзякі Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

ДЗЯРЖАЎНЫ ГЕРБ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**ПАДЗЯКА**
**СТАРШЫНІ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ**
**НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

____________________________________________________________
(прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку грамадзяніна з указаннем яго пасады або назва арганізацыі)
за

____________________________________________________________
(заслугі, за якія аб’яўляецца Падзяка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь)

Старшыня Савета Рэспублікі
Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь ______________ ____________________
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)
М.П.

Распараджэнне
ад «__» ___________ 20__ г. №